The Holy See

Апостальскі ліст

*Misericordia et misera*
Святога Айца

Францішка

на заканчэнне
Надзвычайнага Юбілею Міласэрнасці

Пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

Міласэрнасць і няшчасная – гэта два словы, да якіх звяртаецца св. Аўгустын пры апісанні сустрэчы Езуса з чужаложніцай (пар. 8,1-11). Ён не змог знайсці больш прыгожых і сугучных паміж сабою словаў, каб растлумачыць сабе таямніцу любові Бога, які выходзіць насустрач грэшніку: «Засталіся двое: няшчасная і міласэрнасць»[1]. Колькі ж у гэтым апісанні Божага спачування і справядлівасці! Павучэнне, якое вынікае з гэтага апавядання, пралівае святло на заканчэнне Надзвычайнага Юбілею Міласэрнасці і адначасова паказвае шлях, якім мы павінны ісці ў будучым.

1. Гэтую старонку Евангелля можна справядліва лічыць выявай таго, што мы адзначалі ў Святым Годзе, у часе багатым на міласэрнасць, якая надалей хоча і ў нашых супольнасцях. Міласэрнасць не можа быць нейкім лірычным адступленнем у жыцці Касцёла, бо яна з'яўляецца яго жыццём і робіць відавочнай і адчувальнай глыбокую праўду Евангелля. Усё аб'яўляецца ў міласэрнасці; усё вырашаецца праз міласэрную любоў Айца.

Сустрэліся жанчына і Езус. Яна – чужаложніца, і паводле Закону заслугоўвала на пакаранне праз укаменаванне; Ён сваім вучэннем і абсалютным дарам з сябе, што прыводзіць Яго на крыж, вярнуў Закону Майсея яго сапраўдную і першасную сутнасць. У цэнтры знаходзіцца не Закон і заснаваная на ім справядлівасць, але любоў Бога, якая ўмее чытаць сэрца кожнага чалавека, каб зразумець яго найбольш схаваныя жаданні, і якая павінна пераўзысці ўсё. Аднак у гэтым евангельскім апавяданні сустракаюцца не абстрактныя грэх і асуджэнне, але грэшніца і Збаўца. Езус глядзеў гэтай жанчыне ў вочы і чытаў у яе сэрцы: знайшоў там

жаданне быць зразуметай, атрымаць прабачэнне і вызваленне. Галеча граху была закрытая міласэрнай любоўю. З боку Езуса няма ніякага асуджэння, пазбаўленага літасці і спачування да стану грэшніцы. Людзям, якія хацелі асудзіць яе і пакараць смерцю, Езус адказвае доўгім маўчаннем, якое дазваляе голасу Бога дзейнічаць у сумленні; як у сумленні жанчыны, так і ў сумленні яе абвінаваўцаў, якія пакінулі камяні і ўсе, адзін за другім, пачалі адыходзіць (пар. 8, 9). І пасля гэтага маўчання Езус кажа: «Жанчына, дзе яны? Ніхто не асудзіў цябе?… І Я не асуджаю цябе. Ідзі і адгэтуль больш не грашы» (в. 10-11). Так дапамагае ёй з надзеяй глядзець у будучыню і быць гатовай распачаць нанова сваё жыццё. Адгэтуль, калі захоча, зможа «пастурпаць у любові» (пар.  5, 2). Калі мы будзем акрытыя для міласэрнасці, то большай за існуючы стан слабасці і граху стане любоў, якая дазваляе глядзець далей і жыць інакш.

2. Дарэчы, Езус выразна вучыць гэтаму. Калі фарысей запрасіў Яго на пасілак, да Езуса падышла жанчына, вядомая ўсім як грэшніца (пар.  7, 36-50). Яна намасціла алеем ступні Езуса, абмыла іх сваімі слязьмі і высушыла сваімі валасамі (пар. в. 37-38). Абураным фарысеям Езус адказаў: «Даруюцца ёй грахі многія за тое, што яна вельмі палюбіла. А каму мала даруецца, той мала любіць» (в. 47).

 з’яўляецца найбольш бачным знакам любові Айца, якую Езус хацеў аб’яўляць усім сваім жыццём. Няма такой старонкі Евангелля, якая б не мела гэтага наказу любові, што вядзе аж да прабачэння. Нават у апошнюю хвіліну свайго зямнога жыцця, калі быў прыбіты да крыжа, Езус вымаўляе словы прабачэння: «Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць» ( 23, 34).

Усё, што грэшнік у скрусе прадстаўляе міласэрнасці Бога, ахоплена Яго прабачэннем. Таму ніхто з нас не можа абмежаваць міласэрнасць умовамі. Яна заўсёды з’яўляецца бескарыслівым чынам нябеснага Айца, незаслужанай і безумоўнай любоўю. Таму мы не можам дазволіць сабе супрацьстаяць поўнай свабоды любові, з якой Бог уваходзіць у жыццё кожнага чалавека.

Міласэрнасць з’яўляецца тым канкрэтным дзеяннем любові, якое праз прабачэнне выпраўляе і перамяняе жыццё. Такім чынам праяўляецца Яго боская таямніца. Бог – міласэрны (пар.  34, 6), Яго міласэрнасць трывае навекі (пар.  136), з пакалення ў пакаленне ахоплівае кожную асобу, якая давярае Яму, перамяняе яе і напаўняе сваім уласным жыццём.

3. Якая ж вялікая радасць напоўніла сэрцы гэтых дзвюх жанчын, чужаложніцы і грэшніцы! Дзякуючы прабачэнню яны нарэшце адчулі сябе як ніколі свабоднымі і шчаслівымі. Слёзы сораму і болю змяніліся ва ўсмешку таго, хто ведае, што яго любяць. Міласэрнасць абуджае , бо сэрца адкрываецца на надзею новага жыцця. Невыказнай ёсць радасць прабачэння, але яна выяўляецца ў нас заўсёды, калі мы яе адчуваем. Яе крыніцай з’яўляецца любоў, з якой Бог выходзіць нам насустрач, разрываючы кола нашага эгаізму, каб і мы сталі

прыладамі міласэрнасці.

Вельмі важнымі з’яўляюцца для нас таксама даўнія словы, якімі кіраваліся першыя хрысціяне: «Апраніся ў радасць, якая заўсёды цешыць Бога і падабаецца Яму. Напоўніся ёю, бо кожны вясёлы чалавек здзяйсняе добрыя ўчынкі і мае добрыя думкі… Кожны, хто адкіне сум і апранецца толькі ў радасць, будзе жыць для Бога»[2]. Спазнанне міласэрнасці дае радасць. Не дазволім жа, каб яе ў нас адабралі розны смутак і розныя перажыванні. Няхай яна глыбока закараніцца ў нашых сэрцах і дапаможа нам заўсёды са спакоем глядзець на штодзённае жыццё.

У культуры, у якой часта мае перавагу тэхніка, ёсць штораз больш розных формаў смутку і адзіноты, у якія трапляе мноства людзей, у тым ліку і шмат моладзі. Выглядае, што будучыня знаходзіцца ў палоне няпэўнасці, якая не дазваляе дасягнуць стабільнасці. Таму часта ўзнікае пачуццё меланхоліі, суму і нуды, якія могуць паступова прывесці да роспачы. Нам патрэбны сведкі надзеі і сапраўднай радасці, каб адагнаць ілюзіі, якія абяцаюць лёгкае шчасце са штучным раем. Глыбокая пустка многіх асобаў можа быць запоўнена надзеяй, якую носім у сэрцы, і радасцю, што з яе вынікае. Існуе вялікая патрэба ў пазнанні радасці, якая аб’яўляецца ў сэрцы пад уздзеяннем міласэрнасці. Таму належна прымем словы Апостала: «Заўсёды радуйцеся ў Пану» ( 4, 4; пар. *1*  5, 16).

4. Мы перажылі інтэнсіўны Год, падчас якога мы былі шчодра адораныя ласкай міласэрнасці. Дабрыня і міласэрнасць Пана разліліся па ўсім свеце як імклівы і дабратворны вецер. Перад любячым позіркам Пана, які так доўга звяртаўся да кожнага з нас, мы не можам застацца абыякавымі, бо гэты позірк перамяняе жыццё.

Мы адчуваем патрэбу перадусім падзякаваць Пану і сказаць: «Пане, Ты быў ласкавы да сваёй зямлі [...], дараваў беззаконне свайму народу» ( 85, 2-3). Менавіта так: Бог знішчыў нашую несправядлівасць і кінуў у марскія глыбіні нашыя грахі (пар. *М* 7, 19); больш не памятае пра іх, пакінуў іх за сабою (пар. *І* 38, 17); як далёка ўсход ад захаду, так Ён аддаліў ад нас нашыя правіны (пар.  103, 12).

У гэты Святы Год Касцёл змог пачуць і зведаць шчодры плён прысутнасці і блізкасці Айца, які праз Духа Святога больш выразна паказаў яму дар і наказ Езуса Хрыста наконт прабачэння. Гэта сапраўды было як новае наведванне Пана, які быў сярод нас. Мы адчулі Яго жыццядайны подых, які напоўніў Касцёл, і ў чарговы раз Яго словы паказалі місію: «Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя; на кім пакінеце, на тым застануцца» ( 20, 22-23).

5. Сёння, пасля заканчэння гэтага Юбілею, настаў час паглядзець у будучыню і зразумець, як ісці далей з вераю, радасцю і энтузіязмам, каб зведаць багацце Божай міласэрнасці. Нашыя супольнасці надалей могуць быць жывымі і дынамічнымі ў справе новай

евангелізацыі настолькі, наколькі «пастырская аднова», да якой мы пакліканы[3], будзе штодзённа адбываецца пад уплывам аднаўляльнай моцы міласэрнасці. Не будзем абмяжоўваць яе дзеяння. Не будзем засмучаць Духа, які заўсёды паказвае новыя шляхі, каб усім занесці Евангелле збаўлення.

Па-першае, мы пакліканы  міласэрнасць. Колькі ж багацця ёсць у малітве Касцёла, калі ён заклікае Бога як міласэрнага Айца! У літургіі міласэрнасць не толькі шматразова заклікаецца, але сапраўды прымаецца і перажываецца. Ад пачатку да канца   міласэрнасцю прасякнуты дыялог паміж малітоўным сходам і сэрцам Айца, якое радуецца, калі можа разліваць сваю міласэрную любоў. Пасля просьбы аб прабачэнні напачатку ў заклікý: «Пане, змілуйся над намі», мы адразу ж атрымліваем пацвярджэнне: «Няхай змілуецца над намі Бог усемагутны і, адпусціўшы нам грахі, давядзе нас да жыцця вечнага». Менавіта з такой надзеяй супольнасць збіраецца перад Панам, асабліва ў святы дзень уваскрасення. Многія малітвы «калекты» прагнуць нагадаць пра вялікі дар міласэрнасці. Напрыклад, у перыяд Вялікага посту мы молімся, кажучы: «Божа, крыніца ўсялякае міласэрнасці і дабрыні, Ты нам даў як лекі ад граху пост, малітву і добрыя ўчынкі, спагадна прымі прызнанне ў нашай слабасці, а калі мы падаем пад цяжарам нячыстага сумлення, няхай заўсёды падымае нас Твая міласэрнасць»[4]. Затым мы заглыбляемся ў вялікую эўхарыстычную малітву з прэфацыяй, якая абвяшчае: «Ты ў сваёй міласэрнасці так палюбіў свет, што спаслаў нам як Адкупіцеля свайго Сына. Ён стаў падобным да нас ва ўсім, апрача граху»[5]. Чацвёртая эўхарыстычная малітва з’яўляецца таксама гімнам міласэрнаму Богу: «Ты ... міласэрна дапамог усім, каб Цябе шукалі і знаходзілі». «Просім Цябе, змілуйся над усімі намі»[6], – гэта настойлівая просьба, якую вымаўляе святар у эўхарыстычнай малітве, выпрошваючы ўдзел у вечным жыцці. Пасля Малітвы Панскай святар працягвае: «дапамажы нам у міласэрнасці сваёй», і просіць аб спакоі і вызваленні ад граху. А перад знакам супакою, які ў святле атрыманага прабачэння з’яўляецца выразам братэрства і ўзаемнай любові, зноў моліцца: «не зважай на грахі нашыя, але на веру Касцёла Твайго»[7]. У гэтых словах мы з пакораю і даверам просім аб дары еднасці і спакою для святой Маці – Касцёла. Цэлебрацыя міласэрнасці дасягае сваёй вяршыні ў Эўхарыстычнай Ахвяры, ва ўспаміне Пасхальнай таямніцы Хрыста, з якой выплывае збаўленне для кожнага чалавека, для гісторыі і для ўсяго свету. Наогул, кожны момант эўхарыстычнай цэлебрацыі – гэта зварот, скіраваны да Божай міласэрнасці.

Ва ўсім сакрамэнтальным жыцці мы шчодра атрымліваем міласэрнасць. Мае значэнне тое, што Касцёл выразна хацеў звярнуцца да міласэрнасці ў формуле двух сакрамэнтаў, якія называюцца сакрамэнтамі «аздараўлення», а менавіта: паяднанне і намашчэнне хворых. Формула адпушчэння грахоў кажа: «Бог, Айцец міласэрнасці, які праз смерць і ўваскрасенне свайго Сына паяднаў з сабою свет і спаслаў Духа Святога дзеля адпушчэння грахоў, няхай дасць табе прабачэнне і спакой праз паслугу Касцёла»[8], а ў формуле намашчэння гаворыцца: «Праз гэтае святое намашчэнне і сваю бясконцую міласэрнасць няхай Пан умацуе цябе ласкаю Духа Святога»[9]. Такім чынам, у малітве Касцёла зварот да

міласэрнасці не з'яўляецца толькі павучэннем, але чымсьці вельмі , гэта значыць, што калі мы вымаўляем гэтыя словы з верай, то гэтая міласэрнасць нам удзяляецца. Калі вызнаём яе як нешта жывое і рэальнае, то яна сапраўды нас перамяняе. Гэта сутнасць нашай веры, якую мы павінны захаваць ва ўсёй яе непаўторнасці: перад з'яўленнем граху мы маем аб'яўленне любові, з якой Бог стварыў свет і людзей. Любоў – гэта першы чын, у якім Бог дае пазнаць сябе і выходзіць нам насустрач. Таму няхай нашыя сэрцы будуць адкрытыя на давер, што Бог любіць нас. Яго любоў заўсёды нас апярэджвае, спадарожнічае нам і застаецца з намі, не зважаючы на наш грэх.

6. У гэтым кантэксце асаблівае значэнне набывае таксама *.* У кожную нядзелю Божае слова абвяшчаецца ў хрысціянскай супольнасці, каб Дзень Пана быў напоўнены святлом, якое выпраменьвае з Пасхальнай таямніцы[10]. У эўхарыстычнай цэлебрацыі мы можам быць сведкамі сапраўднага дыялогу паміж Богам і Яго народам. У біблійных чытаннях мы нанова перажываем гісторыю нашага збаўлення праз няспынную справу міласэрнасці, якая была абвешчана. Бог і сёння размаўляе з намі як з сябрамі[11], каб спадарожнічаць нам і паказваць дарогу жыцця. Яго слова выяўляе нашыя патрэбы і клопаты, а таксама становіцца плённым адказам, каб мы змаглі непасрэдна адчуць Яго блізкасць. Наколькі важнай становіцца , у якой «праўда ідзе поруч з прыгажосцю і дабром»[12], выклікаючы трымценне сэрца веруючых перад цудоўнай міласэрнасцю! Вельмі рэкамендую рыхтаваць гамілії і клапаціцца пра казнадзейства. Яно будзе настолькі плённым, наколькі сам святар спазнае міласэрную дабрыню Пана. Пераказванне ўпэўненасці, што Бог любіць нас, не з'яўляецца практыкаваннем па рыторыцы, але ўмовай сапраўднасці самога святарства. Жыць міласэрнасцю – гэта найлепшы шлях. Такое жыццё становіцца праўдзівым абвяшчэннем суцяшэння і навяртання ў пастырстве. Гамілію, як і катэхезу, павінна падтрымліваць гэтае жывое сэрца хрысціянскага жыцця.

7. – гэта цудоўны аповед пра цуды Божай міласэрнасці. Кожная яе старонка прасякнута любоўю Айца, які ад стварэння хацеў пакінуць у свеце знакі сваёй любові. Дух Святы праз словы прарокаў і творы мудрацоў сфармаваў гісторыю Ізраэля як прызнанне міласэрнай любові і блізкасці Бога, нягледзячы на нявернасць народу. Жыццё Езуса і Яго вучэнне выразна вызначылі гісторыю хрысціянскай супольнасці, якая зразумела, што на падставе наказу Хрыста яе місія заключаецца ў тым, каб заўсёды быць прыладаю Яго міласэрнасці і прабачэння ( 20, 23). Праз Святое Пісанне, ажыўленае верай Касцёла, Пан надалей прамаўляе да сваёй Абранніцы і ўказвае ёй дарогу, каб Евангелле збаўлення дасягнула ўсіх. Я горача жадаю, каб Божае слова штораз больш шанавалася, пазнавалася і пашыралася, каб дзякуючы яму можна было лепш зразумець таямніцу любові, якая выцякае з гэтай крыніцы міласэрнасці. Аб гэтым выразна нагадвае Апостал: «Усё Пісанне натхнёнае Богам і карыснае для навучання, для пераконвання, для настаўлення, для выхавання ў праведнасці» (*2* 3, 16).

Было б добра, каб кожная супольнасць у адну з нядзель літургічнага года магла аднавіць

свой удзел у пашырэнні, пазнанні і паглыбленні ведаў Святога Пісання: цалкам адну нядзелю прысвяціць Божаму слову, каб зразумець невычэрпнае багацце, якое нясе гэты пастаянны дыялог паміж Богам і яго народам. Няхай творчае натхненне ўзбагаціць гэтую падзею ініцыятывамі, каб заахвоціць вернікаў быць жывой прыладаю пашырэння Божага слова. Напэўна, сярод гэтых ініцыятываў мае месца больш шырокае распаўсюджванне *lectio divina*, каб у малітоўным чытанні святога тэксту падтрымлівалася і развівалася духоўнае жыццё. *Lectio divina* на тэмы міласэрнасці дазволіць пераканацца, наколькі плённым з'яўляецца святы тэкст, які чытаецца ў святле ўсёй духоўнай традыцыі Касцёла, і з гэтага павінны вынікаць канкрэтныя чыны і справы міласэрнасці[13].

8. Цэлебрацыя міласэрнасці асаблівым чынам адбываецца ў . У ім мы адчуваем дотык Айца, які выходзіць нам насустрач, каб вярнуць нам ласку зноў быць Яго дзецьмі. Мы – грэшнікі і маем у сабе цяжар супярэчнасці паміж тым, што мы хацелі б зрабіць, і тым, што сапраўды робім (пар.  7, 14-21). Аднак ласка заўсёды апярэджвае нас і набывае аблічча міласэрнасці, якое прыносіць плён праз паяднанне і прабачэнне. Бог робіць так, што мы спасцігаем Яго вялізную любоў менавіта праз нашую грэшнасць. Ласка – мацнейшая і пераўзыходзіць розныя магчымыя перашкоды, бо любоў усё перамагае (пар. *1*  13, 7).

У сакрамэнце прабачэння Бог паказвае дарогу вяртання да Яго і заахвочвае да новага адчування Яго блізкасці. Гэта прабачэнне, якое можна атрымаць перадусім тады, калі пачнём  . Пра гэта нагадвае таксама апостал Пётр, калі піша, што «любоў закрывае мноства грахоў» (*1*  4, 8). Толькі Бог прабачае грахі, але таксама ад нас патрабуе гатоўнасці прабачаць іншым, як Ён прабачае нам: «Адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым» ( 6, 12). Як жа сумна, калі мы замыкаемся ў сабе і няздольныя прабачаць! Перамагае крыўда, злосць, помста, якія робяць жыццё нешчаслівым і знішчаюць радасць ад дзейнасці на карысць міласэрнасці.

9. Спазнаннем ласкі, якую меў Касцёл з такім плёнам у Юбілейным Годзе, была напэўна паслуга  . Іх пастырская праца мела на мэце выразна паказаць, што Бог не ставіць ніякіх перашкодаў перад тымі, хто шукае Яго ў скрусе сэрца, бо выходзіць усім насустрач як Айцец. Я атрымаў шмат сведчанняў радасці з прычыны новай сустрэчы з Панам у сакрамэнце споведзі. Не будзем жа губляць магчымасці перажываць веру таксама як паяднанне. «Паяднайцеся з Богам» (*2*  5, 20). Гэтае заахвочванне таксама сёння Апостал скіроўвае да кожнага верніка, каб ён адкрыў моц любові, якая робіць «новым стварэннем» (*2*  5, 17).

Я выказваю сваю ўдзячнасць кожнаму місіянеру міласэрнасці за гэтую каштоўную паслугу, дадзеную для таго, каб зрабіць плённай ласку прабачэння. Аднак гэтая надзвычайная паслуга не заканчваецца разам з закрыццём Святых Дзвярэй. Прагну, каб яна працягвалася, пакуль не будзе адклікана, як канкрэтны знак, што ласка Юбілею надалей ёсць жывой і плённай у розных частках свету. Апеку над місіянерамі міласэрнасці ў гэты час будзе

здзяйсняць Папская Рада па новай евангелізацыі як знак майго непасрэднага клопату і блізкасці, а таксама пошуку найбольш адпаведных формаў выканання гэтай каштоўнай паслугі.

10. Зноў заахвочваю святароў з вялікай стараннасцю рыхтавацца да паслугі споведзі, якая з'яўляецца сапраўднай місіяй святара. Я шчыра дзякую вам за вашае служэнне і прашу, каб вы былі для ўсіх; міласэрнай любові Айца, нягледзячы на цяжкасць граху; памочнікамі ў разважанні над учыненым злом; ў прадстаўленні маральных прынцыпаў; спадарожнічаць верным у працэсе пакаяння, цярпліва дапамагаючы ім; ў разуменні кожнай канкрэтнай сітуацыі; ва ўдзяленні Божага прабачэння. Як Езус перад жанчынай-чужаложніцай пастанавіў маўчаць дзеля явыратавання яе ад смерці, так і святар у канфесіянале няхай будзе велікадушным, ведаючы, што кожны пэнітэнт нагадвае яму пра яго асабісты стан: грэшніка, але распарадчыка міласэрнасці.

11. Хацеў бы, каб мы ўсе паразважалі над словамі Апостала, напісанымі напрыканцы яго жыцця, калі ён вызнаваў перад Цімафеем, што з'яўляецца першым сярод грэшнікаў, аднак спазнаў міласэрнасць (пар. *1* 1, 16). Яго словы маюць незвычайную моц, якая правакуе таксама і нас задумацца над нашым жыццём і заўважыць у ім дзеянне Божай міласэрнасці ў перамене, навяртанні і пераўтварэнні нашага сэрца: «Я дзякую нашаму Пану Езусу Хрысту, які ўмацаваў мяне, таму што Ён палічыў мяне вартым даверу, паставіўшы сабе на служэнне, хоць я раней быў блюзнерцам, пераследнікам і крыўдзіцелем. Але я быў памілаваны, таму што рабіў гэта ў няведанні і бязвер'і» (*1* 1, 12-13).

Таму прыгадаем з пастаянна новым пастырскім запалам словы Апостала: «Бог праз Хрыста паяднаў нас з сабою і даў нам служэнне паяднання» (*2* 5, 18). Мы першымі атрымалі прабачэнне, думаючы пра гэтую паслугу; мы асабіста сталі сведкамі ўніверсальнасці прабачэння. Няма такога закону ці наказу, якія маглі б перашкодзіць Богу зноў абняць сына, які вяртаецца да Яго, прызнае сваю памылку і вырашае распачаць усё нанова. Спыненне толькі на законе было б раўназначна знішчэнню веры і Божай міласэрнасці. Закон, мэтаю якога з'яўляецца любоў (пар. *1* 1, 5), мае падрыхтоўчую вартасць (пар. 3, 24). Аднак хрысціянін пакліканы жыць навізной Евангелля, законам «Духа жыцця ў Езусе Хрысце» ( 8 ,2). У найбольш складаных выпадках, калі маем спакусу аддаць перавагу справядлівасці, якая вынікае толькі з нормаў, трэба верыць у моц, якая вынікае з Божай ласкі.

Мы, спаведнікі, з'яўляемся сведкамі многіх навяртанняў, якія адбываюцца на нашых вачах. Таму давайце адчуваць адказнасць за жэсты і словы, якія могуць дасягнуць глыбіні сэрца пэнітэнта, каб адкрыць блізкасць і любоў Айца, які прабачае. Не будзем разбураць тыя хвіліны дзеяннямі, што супярэчаць спазнанню жаданай міласэрнасці. Будзем дапамагаць хутчэй у асвятленні асабістага сумлення бясконцай любоўю Бога (пар. *1* 3, 20).

Сакрамэнт паяднання павінен зноў знайсці сваё цэнтральнае месца ў хрысціянскім жыцці.

Для гэтага неабходны святары, якія прысвячаюць сваё жыццё «паслузе паяднання» (*2* 5, 18), каб усе мелі магчымасць адчуць зыходзячую моц прабачэння, бо нікому ў скрусе не забараняецца атрымліваць любоў Айца, які чакае яго вяртання.

Зручнай нагодай для гэтага можа быць ажыццяўленне ініцыятывы «24 гадзіны для Пана» перад IV нядзеляй Вялікага посту, якая ўжо добра прымаецца ў дыяцэзіях і з’яўляецца пераканаўчым пастырскім запрашэннем глыбока перажываць сакрамэнт споведзі.

12. Зыходзячы з гэтага патрабавання, каб не было ніякай перашкоды паміж просьбай аб паяднанні і Божым прабачэннем, удзяляю ўсім святарам, паводле моцы іх паслугі, уладу адпушчэння грахоў асобам, якія здзейснілі грэх аборту. Тое, што было ўдзелена мною на час Юбілею[14], цяпер працягнута, незалежна ад якіх-небудзь супярэчных распараджэнняў. Я хацеў бы моцна падкрэсліць, што аборт з’яўляецца цяжкім грахом, бо перарывае нявіннае жыццё. Аднак з аднолькавай моцаю магу і павінен сцвердзіць, што няма ніводнага граху, якога не змагла б ахапіць і знішчыць Божая міласэрнасць, калі сустракаецца са скрушаным сэрцам, якое просіць аб паяднанні з Айцом. Таму няхай кожны святар стане правадніком, падтрымкаю і суцяшэннем, няхай спадарожнічае пэнітэнтам на гэтым канкрэтным шляху паяднання.

У Юбілейным Годзе я згадзіўся на тое, каб вернікі, якія з розных прычын наведваюць касцёлы, у якіх служаць святары Брацтва Святога Пія X, маглі правамерна і законна атрымаць сакрамэнтальнае адпушчэнне грахоў[15]. Дзеля пастырскай карысці гэтых вернікаў і спадзеючыся на добрую волю святароў, каб можна было атрымаць з Божаю дапамогаю паўнату зносін у каталіцкім Касцёле, на моцы майго ўласнага рашэння пастанаўляю працягнуць гэтую магчымасць па-за часам Юбілею, аж да выдання новых пастаноў у гэтай справе, каб усім заўсёды хапіла сакрамэнтальнага знаку паяднання праз прабачэнне Касцёла.

13. Міласэрнасць мае таксама аблічча . «Суцешце, суцешце мой народ!» ( 40, 1). Гэта сардэчныя словы, якія прарок дазваляе пачуць таксама сёння, каб да тых, хто церпіць і ахоплены болем, маглі дайсці словы надзеі. Ніколі не дазволім пазбавіць сябе надзеі, якая выплывае з веры ва ўваскрослага Пана. Гэта праўда, што мы часта маем цяжкія выпрабаванні, але заўсёды нам павінна хапаць упэўненасці, што Пан нас любіць. Яго міласэрнасць выяўляецца таксама ў блізкасці, пяшчоце і падтрымцы, якія многія браты і сёстры могуць прапанаваць, калі надыходзяць дні смутку і няшчасця. Выціранне слёз – гэта канкрэтнае дзеянне, якое разрывае кола самоты, у якім мы часта замыкаемся.

Мы ўсе патрабуем суцяшэння, бо ніхто не вызвалены ад цярпення, болю і незразумення. Колькі болю можа прынесці горкае слова, сказанае з варожасцю, зайздрасцю і злосцю! Колькі цярпення прыносіць здрада, гвалт і пакінутасць; а колькі горычы ў смерці блізкіх асобаў! Аднак Бог заўсёды блізка, калі мы перажываем гэтыя трагедыі. Словы надзеі,

абдымкі разумення, пяшчотная любоў, малітва, якая ўмацоўвае... – усё гэта выяўляе блізкасць Бога праз суцяшэнне з боку братоў.

Нярэдка таксама вялікай дапамогаю можа быць маўчанне, бо часам не хапае словаў, каб адказаць на пытанні церпячых людзей. Аднак недахоп словаў можа замяніць спачуванне тых, хто побач, блізкіх, каханых, тых, хто працягвае руку. Няпраўда, што маўчанне з'яўляецца чынам падпарадкавання. Наадварот, гэта хвіліна сілы і любові. Маўчанне таксама адносіцца да нашай мовы суцяшэння, бо перамяняецца ў практыку спачування і саўдзел у цярпенні брата.

14. Менавіта ў час, такі як наш, калі сярод многіх крызісаў ёсць таксама крызіс сям'і, важна, каб у нашыя сем'і патрапіла слова суцяшэння. Дар сужэнства – гэта вялікае пакліканне, на якое дзякуючы ласцы Хрыста трэба адказаць велікадушнай, вернай і цярплівай любоўю. Прыгажосць сям'і трывае нязменна насуперак розным зацьменням і альтэрнатыўным прапановам: «Радасць любові, якая жыве ў сем'ях, – гэта і радасць Касцёла»[16]. Дарога жыцця, якая вядзе мужчыну і жанчыну да сустрэчы, закаханасці і абяцання перад Богам вернасці назаўсёды, часта перарываецца цярпеннем, здрадай і адзінотай. Радасць з прычыны дару дзяцей не пазбаўляе бацькоў страху за іх развіццё, адукацыю і будучыню, годную таго, каб яе пражыць актыўна.

Ласка сакрамэнту сужэнства не толькі ўмацоўвае сям'ю, каб яна была прывілеяваным месцам, дзе можна сустрэцца з міласэрнасцю, але абавязвае хрысціянскую супольнасць і ўсю пастырскую дзейнасць больш выразна сведчыць пра вялікае станоўчае значэнне сям'і. Аднак гэты Юбілейны Год не можа прычыніцца да таго, што мы страцім з поля зроку складанасць сённяшняй сітуацыі сям'і. Вопыт міласэрнасці дазваляе нам разглядаць усе чалавечыя праблемы з пункту гледжання любові Бога, якая нястомна прымае нас і спадарожнічае нам[17].

Мы не можам забываць пра тое, што кожны нясе з сабою багацце і цяжар уласнай гісторыі, што адрознівае яго ад іншай асобы. Нашае жыццё, з яго радасцю і смуткам, з'яўляецца чымсьці выключным і непаўторным, што праходзіць пад міласэрным позіркам Бога. Гэта патрабуе ад святара перадусім уважлівага, глыбокага і дальнабачнага духоўнага распазнання, каб кожны без выключэння, у кожнай жыццёвай сітуацыі мог адчуць, што канкрэтна ён прыняты Богам, каб актыўна ўдзельнічаць у жыцці супольнасці і быць далучаным да Божага народу, які нястомна імкнецца да паўнаты Божага Валадарства, – валадарства справядлівасці, любові, прабачэння і міласэрнасці.

15. Асаблівае значэнне мае . Касцёл заўсёды перажывае гэты драматычны пераход у святле ўваскрослага Езуса Хрыста, які адкрыў шлях да ўпэўненасці ў будучым жыцці. Мы павінны адказаць на вялікі заклік, асабліва ў сучаснай культуры, якая часта спрашчае смерць да такой ступені, што яна ўкрываецца або прадстаўляецца як звычайная выдумка.

А са смерцю трэба сустрэцца і падрыхтавацца да яе як да балючага і непазбежнага пераходу, поўнага сэнсу: таго апошняга акту любові да асобаў, якіх пакідаем, а таксама да Бога, на сустрэчу з якім ідзём. Ва ўсіх рэлігіях смерць, як і нараджэнне, суправаджаецца рэлігійнай прысутнасцю. Перажываем досвед  як поўную надзеі малітву за душу памерлага і як сведчанне суцяшэння тых, хто церпіць з прычыны расстання з каханай асобай.

Я перакананы, што ў пастырскай дзейнасці, поўнай жывой веры, мы павінны дапамагчы канкрэтна адчуць, наколькі літургічныя знакі і нашыя малітвы выяўляюць міласэрнасць Пана. Гэта Ён сам дае словы надзеі, бо нішто і ніхто не можа адлучыць нас ад Яго любові (пар.  8, 35). Прысутнасць святара ў гэты момант з’яўляецца важнай падтрымкай, бо дазваляе адчуць блізкасць хрысціянскай супольнасці ў хвіліну слабасці, адзіноты, разгубленасці і плачу.

16. Заканчваецца Юбілей і закрываюцца Святыя Дзверы. Аднак дзверы міласэрнасці нашага сэрца заўсёды шырока адкрыты. Мы даведаліся, што Бог схіляецца над намі (пар.  11, 4), каб мы маглі наследаваць Яго, схіляючыся над братамі. Туга многіх, хто жадае вярнуцца ў дом Айца, які чакае іх, абуджаецца таксама шчырымі і шчодрымі сведкамі любові Бога. Святыя Дзверы, праз якія мы прайшлі ў гэтым Юбілейным Годзе, прывялі нас на  , крочыць па якой верна і радасна мы пакліканы кожны дзень. Гэта – шлях міласэрнасці, які дазваляе сустрэць многіх братоў і сясцёр, якія працягваюць руку, каб хтосьці мог за яе схапіцца, каб ісці разам.

Каб быць блізка да Хрыста, трэба стаць бліжнім для братоў, бо нішто не з’яўляецца настолькі прыемным Айцу як канкрэтны ўчынак міласэрнасці. Па сваёй сутнасці міласэрнасць становіцца бачнай і адчувальнай праз канкрэтнае і дынамічнае дзеянне. Калі хтосьці раз у праўдзе яе спазнае, то ўжо не адступіць назад: яна пастаянна ўзрастае і перамяняе жыццё. Гэта сапраўды новае стварэнне, якое дае новае сэрца, здольнае цалкам любіць, і ачышчае вочы, каб яны распазналі найбольш укрытыя патрэбы. Аднак праўдзівымі з’яўляюцца словы, якімі моліцца Касцёл у Пасхальную вігілію пасля чытання пра стварэнне свету: «Усемагутны вечны Божа... учыні, каб адкуплены Табою народ зразумеў, наколькі цудоўнай была справа стварэння на пачатку і яшчэ цудоўнейшай справа адкуплення ў поўні часу»[18].

Міласэрнасць  і  , бо гэта сустрэча двух сэрцаў: Божага сэрца, якое выходзіць насустрач сэрцу чалавека. Гэтае другое распальваецца, а першае аздараўляе яго: скамянелае сэрца перамяняецца ў сэрца з цела (пар.  36, 26), здольнае любіць нягледзячы на свой грэх. Тут чалавек заўважае, што сапраўды з’яўляецца «новым стварэннем» (пар.  6, 15): мяне любяць, а значыць я існую; я атрымаў прабачэнне, а значыць адраджаюся да новага жыцця; я спазнаў міласэрнасць, а значыць я станаўлюся прыладаю міласэрнасці.

17. Падчас Святога Году, асабліва ў «пятніцы міласэрнасці», я меў магчымасць

пераканацца, як шмат дабра ёсць у свеце. Часта пра яго не ведаюць, бо яно штодня здзяйсняецца далікатна і ціха. І хоць пра яго не кажуць, аднак існуе шмат канкрэтных праяваў дабрыні і любові адносна найменшых і найбольш бездапаможных, найбольш самотных і пакінутых. На самай справе існуюць героі любові, якія праяўляюць салідарнасць з убогімі і няшчаснымі. Мы дзякуем Пану за гэтыя каштоўныя дары, якія заахвочваюць бачыць радасць у тым, каб станавіцца бліжнім у абставінах слабасці зраненага чалавецтва. Я з удзячнасцю згадваю многіх валанцёраў, якія штодня прысвячаюць свой час, каб сваёй ахвярнасцю засведчыць аб прысутнасці і блізкасці Бога. Іх служэнне сапраўды з'яўляецца справай міласэрнасці, якая дапамагае многім людзям наблізіцца да Касцёла.

18. Настаў час стварыць прастору міласэрнасці, распачаць шмат новых спраў, якія з'яўляюцца плёнам ласкі. Сёння Касцёл павінен сказаць пра «многія іншыя знакі», якія ўчыніў Езус, але якія «не запісаны» ( 20, 30), каб яны былі красамоўным сведчаннем плённасці любові Хрыста і супольнасці, якая жыве Ім. Мінула ўжо больш за два тысячагоддзі, але справы міласэрнасці надалей робяць бачнымі дабрыню Бога.

Сёння ўсё насельніцтва пакутуе ад голаду і смагі. Вобразы дзяцей, якія не маюць ніякай ежы, выклікаюць сур'ёзную заклапочанасць. Людзі працягваюць эміграваць у масавым парадку з адной краіны ў іншую ў пошуках ежы, працы, жылля і бяспекі. Розныя хваробы з'яўляюцца няспыннай прычынай цярпення, якое патрабуе дапамогі, суцяшэння і падтрымкі. Турмы часта з'яўляюцца не толькі месцам пакарання праз пазбаўленне свабоды, але і месцам нялюдзкіх умоў існавання. Надалей вельмі распаўсюджана непісьменнасць, якая перашкаджае дзецям атрымліваць адукацыю, падвяргаючы іх новым формам рабства. Культура крайняга індывідуалізму, асабліва на Захадзе, вядзе да страты пачуцця салідарнасці і адказнасці за іншых. Сам Бог застаецца для многіх чужым, а гэта з'яўляецца найбольшай бядой і перашкодай у прызнанні непарушнай годнасці чалавечага жыцця.

Увогуле, учынкі міласэрнасці адносна цела і адносна душы з'яўляюцца сёння крытэрыем вялікага і станоўчага ўплыву міласэрнасці як  . Міласэрнасць заахвочвае закасаць рукавы, каб вярнуць годнасць мільёнам людзей, якія з'яўляюцца нашымі братамі і сёстрамі, пакліканымі разам з намі будаваць «варты даверу горад»[19].

19. На працягу гэтага Святога Году зроблена шмат канкрэтных спраў міласэрнасці. Супольнасці, сем'і і паасобныя вернікі нанова адкрылі радасць дзялення і прыгажосць салідарнасці. Аднак гэтага замала. Свет надалей нараджае новыя формы духоўнага і матэрыяльнага ўбоства, якое супярэчыць годнасці асобы. Таму менавіта Касцёл павінен быць заўсёды ўважлівым і гатовым да новых учынкаў міласэрнасці, каб здзяйсняць іх велікадушна і з запалам.

Прыкладайма ўсе намаганні, каб надаць любові канкрэтную форму і адначасова праявіць вынаходлівасць у справах міласэрнасці. Яна інтэгруе, таму мае ўласцівасць

распаўсюджвацца як бліскавіца і не мае межаў. Менавіта ў гэтым сэнсе мы пакліканы надаць новае аблічча даўно вядомым учынкам міласэрнасці. Бо міласэрнасць большая і творчая; яна заўсёды ідзе далей. Яна як рошчына для цеста (пар. *М* 13, 33), як зерне гарчыцы, якое становіцца дрэвам (пар.  13, 19).

Дастаткова падумаць, напрыклад, пра ўчынкі міласэрнасці адносна цела:   (*М* 25, 36. 38. 43. 44). Гэта вядзе нас у сад Эдэн, калі Адам і Ева зразумелі, што яны голыя, і, адчуваючы, што набліжаецца Пан, засаромеліся і схаваліся (пар.  3, 7-8). Ведаем, што Пан іх пакараў; аднак зрабіў для мужчыны і для яго жонкі адзенне са скур і адзеў іх ( 3, 21). Сорам быў пераможаны, а годнасць – вернутая.

Паглядзім таксама на Езуса на Галгоце. На крыжы Сын Божы быў нагі; і лёсы кідалі аб Яго туніцы, і была забраная яна жаўнерамі ( 19, 23-24); Ён ужо нічога не мае. На крыжы яскрава выявілася салідарнасць Езуса з тымі, хто згубіў годнасць, бо яны былі пазбаўлены самага неабходнага. Як Касцёл пакліканы быць «тунікай Хрыста»[20], каб апрануць свайго Пана, так забавязаны таксама праяўляць салідарнасць з нагімі зямлі, каб ім была вернута годнасць, якой былі пазбаўлены. Таму словы: «Быў голы, і вы апранулі Мяне» (*М* 25, 36) забавязваюць нас змагацца з новымі формамі ўбоства і адкідвання, якія пазбаўляюць людзей годнага жыцця.

Адсутнасць працы і належнай узнагароды; немагчымасць мець жыллё ці зямлю, на якой можна было б жыць; дыскрымінацыя паводле веры, расы, грамадскага статусу... – гэтыя і многія іншыя сітуацыі нішчаць годнасць асобы. На іх міласэрная дзейнасць хрысціянаў адказвае перадусім чуйнасцю і салідарнасцю. Колькі ж сёння ёсць розных нагодаў вярнуць людзям годнасць і дазволіць ім на чалавечае жыццё! Дастаткова падумаць пра многіх дзяцей, якія спазнаюць розны гвалт, які пазбаўляе іх радасці жыцця. Іх засмучаныя і разгубленыя твары заўсёды прысутнічаюць у маіх думках. Яны патрабуюць нашай дапамогі ў вызваленні з няволі сучаснага свету. Гэтыя дзеці – заўтрашняя моладзь. Як мы рыхтуем іх да годнага і адказнага жыцця? З якой надзеяй яны могуць супрацьстаяць выклікам сваёй сучаснасці і будучыні?

міласэрнасці патрабуе ад нас выйсця з пасіўнасці, абыякавасці і крывадушша, каб планы і праекты не былі мёртвай літарай. Дух Святы дапаможа нам быць заўсёды гатовымі рабіць свой плённы і бескарыслівы ўклад у тое, каб справядлівасць і годнае жыццё не заставаліся прынагоднымі словамі, але былі канкрэтным удзелам асобаў, якія хочуць быць сведкамі прысутнасці Божага Валадарства.

20. Мы пакліканы развіваць  , абапіраючыся на адкрыццё сустрэчы з іншымі: культуру, у якой ніхто не глядзіць на іншых абыякава або адварочваецца, калі бачыць цярпенне іншых.   ’«»: ніводзін з іх не падобны да іншага; нашыя рукі могуць рабіць іх тысячамі розных спосабаў, і хоць натхняе іх адзін Бог і ёсць адна «матэрыя», з якой яны вырабляюцца, г. зн.

міласэрнасць, аднак кожны мае сваю форму.

Учынкі міласэрнасці па сутнасці датычаць усяго жыцця чалавека. Таму мы можам распачаць сапраўдную культурную рэвалюцыю, пачынаючы менавіта з простых учынкаў, якія могуць ахапіць цела і душу, або інакш жыццё людзей. Гэты ўдзел хрысціянская супольнасць можа зрабіць сваім, усведамляючы, што Слова Пана заўсёды заклікае яе пазбыцца абыякавасці і індывідуалізму, у якіх мы хацелі б замкнуцца, каб весці выгоднае і бесклапотнае жыццё. «Убогіх заўсёды маеце пры сабе» ( 12, 8), кажа Езус сваім вучням. Няма ніякага апраўдання абыякавасці, калі ведаем, што Хрыстус атаясамліваецца з кожным з іх.

Культура міласэрнасці фарміруецца ў вытрывалай малітве, у паслухмянай адкрытасці на дзеянне Духа Святога, у веданні жыцця святых і ў непасрэднай блізкасці да ўбогіх. Гэта вельмі пільны выклік, які не пакідае сумненняў наконт неабходнасці актывізавацца. Спакуса займацца «тэорыяй міласэрнасці» перамагаецца настолькі, наколькі міласэрнасць становіцца штодзённым перажываннем саўдзелу і дзялення. З іншага боку, мы ніколі не павінны забываць словы, у якіх апостал Павел пасля свайго навяртання, расказваючы пра сваю сустрэчу з Пятром, Якубам і Янам, вылучае істотны аспект сваёй місіі і ўсяго хрысціянскага жыцця: «каб толькі мы помнілі пра ўбогіх, і менавіта гэта я старанна рабіў» ( 2, 10). Мы не можам забываць пра ўбогіх: гэтае заахвочванне як ніколі актуальнае і прадыктавана сведчаннем Евангелля.

21. Наш досвед Юбілею выказваюць словы Пятра: «калісьці вы не былі памілаваныя, а цяпер памілаваныя» (*1*  2, 10). Не будзем зайздросна захоўваць для сябе тое, што атрымалі; пастараемся дзяліцца гэтым з церпячымі братамі, каб іх падтрымлівала моц Айцоўскай міласэрнасці. Няхай нашыя супольнасці будуць адкрытымі для асобаў, якія жывуць на іх тэрыторыі, каб усіх дасягнула Божая любоў праз сведчанне веруючых.

. Кожны дзень нашай пілігрымкі пазначаны прысутнасцю Бога, які кіруе нашымі крокамі моцаю ласкі, якую Дух Святы вылівае ў сэрцы, каб зрабіць іх здольнымі любіць. для ўсіх і для кожнага, каб ніхто не думаў, што блізкасць Бога і моц Яго міласэрнай любові не для яго. для слабых і безабаронных, адкінутых і самотных, каб яны маглі сустрэцца з прысутнасцю братоў і сясцёр, якія падтрымаюць іх у патрэбе. для ўбогіх, каб яны адчулі паўнату пашаны і сустрэліся са спагадлівым позіркам тых, хто перамогшы абыякавасць, адкрывае тое, што істотнае ў жыцці. для кожнага грэшніка, каб ён нястомна прасіў аб прабачэнні і адчуў руку Айца, які заўсёды вітае і туліць да сябе.

У святле «Юбілею асобаў адкінутых грамадствам», калі ва ўсіх катэдрах і санктуарыях свету закрываліся Дзверы Міласэрнасці, я зразумеў, што далейшым канкрэтным знакам гэтага Надзвычайнага Святога Году павінна стаць святкаванне ва ўсім Касцёле ў XXXIII нядзелю Звычайнага перыяду Сусветнага Дня Убогіх. Гэта будзе найбольш годнай падрыхтоўкай да ўрачыстасці Пана нашага Езуса Хрыста, Валадара Сусвету, які атаясамліваецца з малымі і

убогімі, а судзіць нас паводле ўчынкаў міласэрнасці (пар. *М* 25, 31-46). Гэта будзе дзень, які дапаможа супольнасцям і кожнаму ахрышчанаму паразважаць над тым, што ўбоства знаходзіцца ў самым цэнтры Евангелля, а таксама над тым, што пакуль Лазар ляжыць каля дзвярэй нашага дому (пар. 16, 19-21), не можа быць ні справядлівасці, ні грамадскага спакою. Гэты дзень будзе таксама сапраўднай формай новай евангелізацыі (пар. *М* 11, 5), пры дапамозе якой трэба аднавіць аблічча Касцёла ў яго адвечнай справе пастырскага навяртання, каб быць сведкам міласэрнасці.

22. На нас заўсёды пазіраюць міласэрныя вочы Святой Маці Божай. Яна першая пракладвае шлях і спадарожнічае нам у даванні сведчання любові. Маці Міласэрнасці збірае ўсіх пад ахову свайго плашча, як часта прадстаўляла Яе мастацтва. Мы спадзяемся на Яе мацярынскую дапамогу і ідзем за Яе адвечным указаннем, каб глядзець на Езуса, які з'яўляецца прамяністым аблічам Божай міласэрнасці.

*, , 20 , , , 2016, .*

---

[1] *In Joh* 33, 5.

[2] «» , XLII, 1-4.

[3] Пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 27.

[4] , III нядзеля Вялікага посту.

[5] , VII прэфацыя на нядзелі Звычайнага перыяду.

[6] , II эўхарыстычная малітва.

[7] , абрад Камуніі.

[8] , 46.

[9] , 76.

[10] Пар. II Ватыканскі Сабор, Канстытуцыя *Sacrosanctum Concilium*, 106.

[11] Пар. II Ватыканскі Сабор, Дагматычная канстытуцыя *Dei verbum*, 2.

[12] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium*, 142.

[13] Пар. Бэнэдыкт XVI, Апост. адгарт. *Verbum Domini*, 86-87.

[14] Пар. , , 1 верасня 2015.

[15] .

[16] Апост. адгарт. *Amoris laetitia*, 1.

[17] Пар. , 291-300.

[18] , Пасхальная вігілія, малітва пасля першага чытання.

[19] Энц. *Lumen fidei*, 50.

[20] Пар. св. Кіпрыян, , 7.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana